На Піліпаўку ваўкі выюць

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: **1.** Атмасферная вільгаць, якая выпадае ў выглядзе дажджу, снегу. **4.** «А воўк імчыцца, снег здзірае, / І толькі ... яго мільгае». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Воўк»). **7.** Піліпаўскі ... . Шасцітыднёвае ўстрыманне ад скаромнага, якое пачынаецца з Піліпаўкі (28 лістапада) і доўжыцца да Каляд (6 студзеня). **9.** ... або Попрадкі; зборы вясковай моладзі ў доўгія восеньскія або зімовыя вечары для сумеснай работы, забавы. **11.** Калі на Піліпаўку пахмурна і снежна, то ... будзе мокры *(прыкм.)*. **13.** Папярэдняя аб'ява. **14.** Невялікае веславое судна. **15.** Лінія сувязі, камунікацыі. **16.** Астравы ў Ціхім акіяне. **17.** Колькасць каго- , чаго- небудзь. **18.** Прадказанне будучыні або мінулага; ... на Піліпаўку каля кроснаў займаліся замужнія жанчыны. **22.** ... плача, а воўк скача *(прык.)*. **23.** І ... каня паваліць, калі воўк дапаможа *(прык.)*. **24.** Гулянка *(разм.)*.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: **1.** Вялікі майстар сваёй справы *(перан.)*. **2.** Воўк не пастух, а казёл не ... ; воўк злодзей, а казёл — шкоднік *(прык.)*. **3.** Асабістая назва чалавека. **5.** Добрым людзям — мір, а шаленцам — галавою ў ... *(прык.)*. **6.** Газеты, часопісы, ТБ, інтэрнэт: усё разам *(абрэв.)*. **8.** Умоўнае тайнае пісьмо; крыптаграфія. **9.** Гон або воўчыя «... »; у ваўкоў яны пачынаюцца ў Піліпаўку. **10.** Стан лёгкасці. **11.** «Мне воўк і ... у паслугах, / Мне служаць вавёрка і лось». З верша Я. Купалы «Мароз». **12.** Паводле падання — чалавек, здольны абарочвацца ў ваўка. **18.** Гурт музыкантаў *(абрэв.)*. **19.** Старажытная назва Оршы. **20.** Шчасце, што не даў ... мядзведзю воўчай смеласці, а ваўку мядзведжай сілы *(прык.)*. **21.** Нота музычнай гамы.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Аналагі. 4. Хвост. 7. Пост. 9. Вячоркі. 11. Май. 13. Анонс. 14. Лодка. 15. Канал. 16. Гавані. 17. Лік. 18. Варажба. 22. Каза. 23. Камар. 24. Гульба.

Па вертыкалі: 1. Ас. 2. Арадник. 3. Імя. 5. Вір. 6. СМІ. 8. Таінанік. 9. «Вясны». 10. Лагерка. 11. Мядзведзь. 12. Вуканак. 18. ВІА. 19. Руа. 20. Бог. 21. Фа.

Будзь у курсе!

Добрыя справы. Зімовы сезон

У першы дзень зімы Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі даў старт зімоваму сезону дабрачыннай акцыі «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям» аднайменнага круглагадовага праекта Саюза моладзі.

У зімовы перыяд валанцёры руху «Добрае Сэрца» дапамогуць пажылым і адзінокім людзям, інвалідам, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны насекчы і скласці дровы, пры неабходнасці — расчысціць прысядзібную тэрыторыю і дарожкі ад снегу.

Звярнуцца па дапамогу да добраахвотнікаў Саюза моладзі можна будзе праз гарачыя лініі, якія пачалі сваю работу з 1 снежня пры ўсіх тэрытарыяльных камітэтах БРСМ.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Шчырага прыхільніка роднай мовы, адданага падпісчыка і аўтара «Звязды» **Валерыя Мікалаевіча ГАЎРЫША** з Чавусаў шчыра віншуем з сямідзесяцігоддзем, з прыгожай круглай датай! Зычым

На многія леты —
здароўя, дабра!
Хай кожны дзянёк
будзе ў свята!
Хай дом за вярсту
абыходзіць бяда,
А радасці будзе багата!

З павагай — звяздоўцы і сябры з усіх куткоў краіны.

Даты | Падзеі | Людзі

4 СНЕЖНЯ

У краіне

1812 год — адбыўся бой пры вызваленні г. Маладзечна расійскімі войскамі ад французаў. Расійскія войскі наступалі на Маладзечна з поўначы праз Вілейку і з усходу. 4 снежня Напалеон адступіў у вёску Беніца (цяпер у Маладзечанскім раёне), дзе ён замацаваўся, узарваўшы мост праз р. Уша. Раніцай 5 снежня рускія ўварваліся ў горад і акружылі французскі ар'ергард, які здаўся. У той жа дзень Напалеон прыбыў у Смаргонь, дзе перадаў камандаванне маршалу Мюрату, а сам рушыў у Парыж.

1923 год — створаны Вышэйшы савет народнай гаспадаркі БССР, дзяржаўны орган кіравання прамысловасцю Беларусі ў 1923—1932 і 1957—1965 гадах.

1938 год — нарадзілася (г. Любань) Ніна Маеўская, беларуская пісьменніца. Працавала ў газеце «Літаратура і мастацтва», загадчыцай рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва», рэдактарам аддзела публіцыстыкі часопіса «Беларусь». У друку выступала з 1955 года. Аўтар зборнікаў аповесцяў і апавяданняў «Ляці, верабейка», «Агата», «Надзеевіч», «Такая позняя вясна», «Холад доннай вады» і іншых, а таксама паэтычных кніг «Падаюць даспелыя ранеты», «Мая ўлюбёная краіна». Памерла ў 2011 годзе.

1943 год — нарадзілася (г. Гродна) Алена Уладзіміраўна Валчэцкая, беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер СССР. Чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў у камандным заліку (1964). Пераможца і прызёр шматлікіх усесаюзных і міжнародных спаборніцтваў.

У свеце

1915 год — нарадзіўся Алег Аляксандравіч Лосік, савецкі і расійскі военачальнік, Герой Савецкага Саюза, маршал бранятанкавых войскаў. Быў апошнім з савецкіх маршалаў бранятанкавых войскаў, якія заставаліся ў жывых. У радах савецкіх і расійскіх танкавых войск — з 1935 да 1992 года, удзельнік баёў у Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З 1941 года ваяваў на Паўночна-Заходнім, Сталінградскім, Данскім, Заходнім, 3-м Беларускім франтах. 2 ліпеня 1944 года танкавая брыгада на чале з палкоўнікам Лосікам зламала супраціўленне праціўніка пад Мінскам (у раёне в. Гарадзішча) і раніцай 3 ліпеня адной з першых увайшла ў горад. Пасля вайны быў на камандных і кіруючых пасадах у Савецкай арміі, выкладчыкам ваенных акадэмій. Памёр у 2012 годзе.

1963 год — нарадзіўся Сяргей Бубка, украінскі савецкі спартсмен-лёгкаатлет па скачках з шастом. Першы ў свеце чалавек, які скокнуў вышэй за шэсць метраў. Заслужаны майстар спорту СССР. Чэмпіён Алімпійскіх гульняў, 6-разовы чэмпіён свету, чэмпіён Еўропы і СССР. Сярэбраны прызёр міжнародных спаборніцтваў «Дружба-84».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.09	16.50	7.41
Віцебск —	9.06	16.33	7.27
Магілёў —	8.59	16.40	7.41
Гомель —	8.48	16.45	7.57
Гродна —	9.23	17.07	7.44
Брэст —	9.16	17.15	7.59

Месяц

Апошняя квадра 30 лістапада.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *УВЯДЗЕННЕ Ў ХРАМ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ БАГАРОДЗІЦЫ. Марыі, Адама.*
К. *Барбары, Хрысціны, Бярнарда, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Я зайздрошчу мужыку, які кожную раніцу бегае вакол дома.

Красоўкі ў яго класныя.

— Якая самая дурная рэч, у якую вы верылі, быўшы дзіцем?

— Што дзённы сон — гэта пакаранне.

Бабуля з дзядулем вельмі любілі гуляць у хованкі. Раніцай бабуля хавала самагонку, а калі дзядуля яе знаходзіў, то ўвечары ўжо хавалася бабуля.

Жонка разгадвае крыжаванку:

— Суцяшальная форма слова «ніколі».

Муж:

— «Потым».

Нейкая бездапаможная нікчэмнасць даслала мне запрашэнне на семінар па павышэнні самаацэнкі.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4520.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 снежня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12